ТРЭЦІ ЭТАП XXXI РЭСПУБЛІКАНСКАЙ АЛІМПІЯДЫ
ПА ВУЧЭБНЫХ ПРАДМЕТАХ «БЕЛАРУСКАЯ МОВА»
І «БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА»

# КОМПЛЕКСНАЯ РАБОТА ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ І ЛІТАРАТУРЫ

*2015 г.*

## ДАВЕДКІ

**9 клас**

**Варыянт І**

| **Заданні** | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | **Усяго** |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **Балы** | **5** | **5** | **5** | **5** | **5** | **5** | **5** | **4** | **6** | **5** | **50** |

### Заданне 1

| **Групы слоў** | **Арфаграфічныя правілы** |
|---|---|
| 1) гл*ы*таць, бр*ы*во, кр*ы*вавы, гр*ы*моты | У некаторых словах спалучэнні *ро*, *ло* не пад націскам чаргуюцца з *ры*, *лы*. |
| 2) ток-шо*у*, фра*у* | Літара *у* (*у* складовае) пішацца на канцы запазычаных слоў не пад націскам. |
| 3) без*ы*ніцыятыўны, над*ы*шоў, дэз*ы*нфекцыя, пад*ы*граць | Літара *ы* пішацца пасля прыставак на зычны ў словах, корань якіх пачынаецца з *і*. |

### Заданне 2

| **Фразеалагізмы-сінонімы** | |
|---|---|
| рассыпацца дробным макам | *ламаць шапку* |
| шапку ў ахапку | *лахі пад пахі* |
| сесці макам | *сесці ў лужыну* |
| з макава зерне | *як старой бабе сесці* |
| бабка надвое варажыла | *віламі па вадзе пісана* |

### Заданне 3

| **Слоўнікавы артыкул** | **Тып слоўніка** |
|---|---|
| **КОПАНКА**, -і, *ДМ* -нцы, *мн.* -і, -нак, *ж.* Выкапаны штучны вадаём, запоўнены вадой; сажалка. ‖ *прым.* **копаначны**, -ая, -ае. | тлумачальны слоўнік |
| **ГОСПИТ//АЛЬ** шпіталь, -ля *м.*; **~АЛЬНЫЙ** шпітальны | руска-беларускі слоўнік |

| | |
|---|---|
| **КОМІН, ТРУБА; ДЫМАР** (*абл.*). Вецер вые, не сціхае, дзіка ў *коміне* шуміць… *Я. Колас.* Заводаў адноўлена многа, і *трубы* над імі дымяць *М. Машара.* Вунь прыстань, вунь заводаў *дымары*… (*А. Зарыцкі*). | слоўнік сінонімаў |
| **па-вод-к-(а)** – *пры ст.-суф.*, *ад* вад-(а), *чарг.* а / о | словаўтваральны слоўнік |
| **Хто зявае, той ваду сярбае (хлябае).** *Гаворыцца з неадабрэннем пра чыю-небудзь някемлівасць, няспрытнасць, што вядзе да адмоўных вынікаў у жыцці.* Вот у цябе што ў хаце? Крэслы абшарпаныя. На сценах пустэча. А ў мяне… Ты быў у мяне? То-та ж… Трэба ўмець жыць. Хто зявае, той ваду сярбае (*І. Макаловіч.* Версія капітана Барташа). | тлумачальны слоўнік прыказак |

**Заданне 4**

| Мадэль | Назва асобы мужчынскага полу |
|---|---|
| 1. аснова дзеяслова + *-льнік-* (□) | *апавядальнік, стваральнік* |
| 2. аснова назоўніка + *-ар-* (*-яр-*) (□) | *свінар, пясняр* |
| 3. *пра* + назоўнік | *праўнук, прадзед* |
| 4. *су* + аснова назоўніка + *нік* (□) | *суайчыннік, суразмоўнік* |
| 5. аснова назоўніка + злучальная галосная + аснова дзеяслова + ø (□) | *мовавед, кнігалюб* |

**Заданне 5**

1) параненыя, сястра, верабей;
2) акуляры, людзі, вараняня;
3) сяброўка, пчаляр, сані;
4) гусь, вучань, рабочы;
5) настаўнік, нажніцы, лісяня;
6) паляўнічы, сабака, твор;
7) дзверы, абцугі, конь;
8) алімпіец, дзіця, запрошаны.

ПРАВІЛЬНЫ АДКАЗ: **2, 4, 5, 7, 8**

КАМЕНТАРЫЙ: Зборныя лічэбнікі спалучаюцца з назвамі асоб мужчынскага полу (*гусляр, доўгажыхар*), маладых істот (*кацяня, жарабя*), субстантываванымі прыметнікамі і дзееприметнікамі (*вучоны, замерзлы*), назоўнікамі *коні, гусі, людзі, свінні*, множналікавымі назоўнікамі (*нажніцы, сані*), асабовымі займеннікамі (*мы, вы* і інш.).

**Заданне 6**

| Неазначальная форма дзеяслова | Дзеяслоў ў форме 2-ой асобы множнага ліку |
|---|---|
| дзерці | *дзерацé* |
| біць | *б'яцé* |
| паліць | *пáліце* |
| есці | *ясцé* |
| грызці | *грызяцé* |

**Заданне 7**

| Беларускае слова | Адпаведнае значэнне ў рускай мове |
|---|---|
| Багáч | *Рождество Пресвятой Богородицы* |
| Вожаг | *черенок ухвата, кочерги, помела и т.д.* |
| Гáфтка | *нитяная или проволочная петля для застёгивания крючка в одежде* |
| Запаты́лак | *клинышек для закрепления косы* |
| Заво́рыны | *начало пахоты* |

ПРАВІЛЬНЫ АДКАЗ: **А5 Б3 В2 Г1 Д4**

**Заданне 8**

| Вершаваныя радкі | Вершаваны памер |
|---|---|
| Ён ведаў, што цемрадзь адыйдзе і згіне,<br>Што звон кайданоў разаб'ецца аб скалы…<br>*П. Броўка «Янку Купалу»* | 4-стопны амфібрахій |
| Роднае слова – страла Перунова<br>Ў чорныя сэрцы выроддзя.<br>*В. Зуёнак «Роднае»* | 4-стопны дактыль |
| Там, дзе нізка схіліліся хаты,<br>Ля ракі, дзе гамоніць аір!<br>Там, дзе ў пушчы па хвоях кудлатых<br>Мігацяць Беларусі страі!<br>*Ул. Дубоўка «Прыпыніла свой голас жалейка…»* | 3-стопны анапест |
| Раскінуліся дзве палескіх вёскі<br>На супрацьлеглых берагах Сажа.<br>Тут песень чутны адгалоскі:<br>Рака – паміж народамі мяжа.<br>*М. Аўрамчык «Раскінуліся дзве палескіх вёскі…»* | 5-стопны ямб |

**Заданне 9**

ПРАВІЛЬНЫ АДКАЗ: **А4 Б6 В1 Г2 Д3 Е5**

**Заданне 10**

| **Пытанні, заданне** | **Адказ** |
|---|---|
| 1. Жанр | ***Байка*** |
| 2. Які тып рыфмоўкі выкарыстаў паэт у першых чатырох радках? | ***Кальцавая (апаясаная) рыфмоўка*** |
| 3. Як у творах гэтага жанру называюць вылучаную курсівам частку? | ***Мараль*** |
| 4. Які алегарычны вобраз выкарыстаны ў творы? | ***Асёл*** |
| 5. Выпішыце адзін эпітэт | ***Доўгі, велічэзны, грозны*** |